Благодаря таким концертам безусловно увеличилась посещаемость и популярность библиотеки. Опыт проведенных мероприятий в рамках проекта виртуального концертного зала показывает, что проект рентабелен, так как заполняемость зала свыше 70 %. Конечно, в данный момент в условиях пандемии мы собираем людей согласно эпидемиологическим требованиям.

Открытие состоялось в октябре 2020 г. На праздничном мероприятии прошел показ всемирно известной сказки Антуана де Сент-Экзюпери «Маленький Принц» в исполнении народного артиста России Юрия Стоянова и сопровождении оркестра Московской филармонии. Первые зрители получили возможность оценить звук и эффект полного присутствия, созданного при помощи дополнительных проекций на стенах и потолке зала.

Мероприятия в виртуальном концертном зале сопровождаются тематическими книжными выставками. Близость книги и музыки помогает жителям города расширить возможности в познании мира искусства, а демократичность библиотеки позволяет каждому желающему посещать мероприятия.

Таким образом, можно сделать вывод, что библиотечные проекты могут являться некой оберткой для традиционной библиотечной услуги. Конечно, это не значит, что единственной целью проекта становится продвижение, скорее говорит о том, что на этапе создания мы можем закладывать продвижение собственных услуг в цели проекта, а потом рассматривать результаты как один из показателей эффективности.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ АРХІЎНАГА ЗБОРУ У. КАРАТКЕВІЧА: КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АСПЕКТ

***А. Я. Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Адна з адметных рысаў сучаснай гістарыяграфіі – намаганне пашырыць кола крыніцазнаўчай базы праз выкарыстанне выяўленчых матэрылаў. Выяўленчыя крыніцы адрозна ад іншых

відаў крыніц утрымліваюць інфармацыю, закадаваную ў пэўных вобразах.

Вывучэнне візуальнай інфармацыі, пакінутай людзьмі, дае магчымасць узнавіць сістэму іх каштоўнасцяў і ўяўленняў. Праз выяўленчае мастацтва перадаюцца візуальныя вобразы культурнай памяці. Бадай, асноўная якасная ўласцівасць выяўленчых крыніц – гэта непасрэдная фіксацыя гістарычнай інфармацыі ў той момант, калі падзея адбываецца. Аднак гэта не азначае, што аўтаматычна ўся інфармацыя выяўленчай крыніцы становіцца абсалютна аб’ектыўнай і дакладнай. Аўтарам кожнай такой крыніцы выступае пэўная асоба з уласным бачаннем падзей, мэтай, намерамі, ступенню ўсведамлення рэальнасці. Яна здольная выказаць сваё асабістае стаўленне да разнастайнай і багатай рэчаіснасці.

Асабліва каштоўнымі выяўленчыя матэрыялы становяцца падчас вывучэння асабістых фондаў дзеячаў культуры. Такія матэрыялы дазваляюць атрымаць інфармацыю пра асобу, розныя аспекты яе штодзённага жыцця і творчасці; такіх звестак не знойдзеш у пісьмовых крыніцах, з аднаго боку, а з другога – яны ўзбагачаюць дадатковымі дэталямі нашы веды аб пэўных падзеях на макрагістарычным узроўні.

Уладзімір Караткевіч ведаў цану архівам і задакументаваным сведчанням гісторыі. З першай часткай свайго архіва ў верасні 1963 г. пісьменнік перадаў у БДАМЛМ трынаццаць малюнкаў і чатыры фотаздымкі. У чэрвені 1976 г. фонд папоўніўся 44 фотаздымкамі. Паводле ўспамінаў супрацоўнікаў архіва-музея, Уладзімір Сямёнавіч дапамагаў архівістам анатаваць фотаздымкі, устанаўліваць даты дакументаў. Пазней частку фотаматэрыялаў і іншых выяўленчых крыніц выбітны літаратар пакінуў на захаванне ў ЦНБ НАН Беларусі. Выяўленчыя матэрыялы збору пісьменніка ў ЦНБ НАН – гэта фатаграфіі і малюнкі, аб’яднаныя ў 50 адзінак захавання. Гэта графіка аўтарства У. Караткевіча і аматарскія фотаздымкі, якія адлюстроўваюць сямейныя і сяброўскія дачыненні, грамадскую дзейнасць літаратара. У снежні 2007 г. архіў-музей разам з папкай са 104 лістамі і паштоўкамі пісьменніка атрымаў каля дваццаці малюнкаў і адзінаццаць фатаграфій [1; 2; 19; 20]. З пэўнымі заўвагамі да выяўленчых матэрыялаў фонду пісьменніка можна далучыць вялікую колькасць мастацкіх (з рэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадукцыямі твораў мастацтва з калекцыі Эрмітажа) і краявідных фотапаштовак, а таксама рэкламныя турыстычныя буклеты аб Чэхаславакіі [36; 38; 39]. Асобна можна адзначыць рэкламны буклет пра цеплаход «Перамога» з дарчым надпісам У. Караткевічу ад першага памочніка капітана [40].

Фотаздымак, як крыніца інфармацыі, стварае вобраз, які спалучае ў сабе выразнасць з сапраўднасцю і ў гэтым імгненні адлюстроўвае істотны момант рэчаіснасці. Перадаючы вобразны бок гістарычнага факта, фотаздымак звычайна выхоплівае даволі дробныя дэталі з'явы ці падзеі, фіксуючы важныя падрабязнасці. Фатаграфія дазваляе не толькі ўявіць падзею, але і асэнсаваць яе праз асаблівасці перадачы руху, кампазіцыйнапрасторавай і часавай еднасці.

Паводле зместу і характару аб'ектаў фотаматэрыялы архіўнага збору У. Караткевіча можна падзяліць на 3 групы: партрэтныя (асабістыя, групавыя партрэты пісьменніка, яго родных і сяброў), падзейныя (адлюстроўваюць пэўныя моманты падзей і факты жыцця) і ілюстрацыйныя (падбор выяў для твораў ці навукова-папулярных фільмаў, у якіх літаратар выступаў сцэнарыстам). Пераважная большасць фатаграфій – аматарскія здымкі. Разглядаць і спрабаваць расшыфраваць гэтыя фота часам няпроста. Многае ў іх было зразумела толькі ўдзельнікам тых падзей [4].

Сярод фотакрыніц – фотапартрэты самога пісьменніка ў розны час. Гэта і афіцыйныя партрэты (іх зусім няшмат), і мастацка-аматарскія на прыродзе, і жартоўныя (напрыклад, з маскай вавёркі), групавыя з роднымі і сваякамі [6. Арк. 1–2; 12. Арк. 1–2; 27. Арк. 1, 3, 5, 7, 11]. Цікавыя вясельныя здымкі з В. Б. Нікіцінай [31; 32].

Праз аматарскія фатаграфіі можна адчуць добразычлівае стаўленне У. Караткевіча да родных і сяброў, дачыненні, якія панавалі ў тагачасным пісьменніцкім асяроддзі. Адкрываюцца рысачкі і самога Уладзіміра Сямёнавіча, яго запал да вандровак.

Адно з цэнтральных месцаў у прозе У. С. Караткевіча належыць падзеям XIX ст., дзейнасці К. Каліноўскага і яго паплечнікаў. Аматарскія фотаздымкі сведчаць, што У. Караткевіч мэтанакіравана наведваў мясціны дзейнасці паўстанцаў, каб шчыльней наблізіцца да тых падзей і сваіх герояў [17. Арк. 1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У асабістым фондзе пісьменніка ёсць канспекты лекцый па гісторыі мастацтваў – яшчэ са студэнцкіх гадоў У. С. Караткевіч цікавіўся архітэктурай [24. Арк. 39–47]. Гэтую цікавасць ён пранёс праз усё жыццё, аб чым сведчаць накіды да публіцыстычных твораў, сцэнарыі навукова-папулярных стужак, вялікая колькасць паштовак з выявамі помнікаў архітэктуры Беларусі, Балгарыі, Польшчы, Чэхіі і Славакіі, якія літаратар наведаў падчас адпачынку [16. Арк. 1, 33, 36]. У зборы ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца 79 фотаздымкаў помнікаў архітэктуры Беларусі, якія У. Караткевіч вывучаў падчас падрыхтоўкі дакументальнай стужкі «Памяць» [37].

Значнае месца ў творчасці пісьменніка займала супрацоўніцтва з кінематаграфістамі. У. С. Караткевіч быў выдатным сцэнарыстам. Але дачыненні пісьменніка з рознымі сцэнарнымі калегіямі і мастацкімі саветамі складваліся няпроста. Часам лёс саміх фільмаў быў пакручасты. Можна прыгадаць гісторыю фільма «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», знятага на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1967 г. (рэжысёр В. С. Бычкоў пры ўдзеле С. К. Скварцова). У. С. Караткевіч і сам выступіў акцёрам у фільме: сыграў дзве эпізадычныя ролі – *ксяндза і татарына.* Аб гэтым перыядзе творчасці літаратара у зборы БДАМЛМ захаваўся шэраг фотаздымкаў [10. Арк. 1–4]. Пра актыўную працу над фільмам «Дзікае паляванне караля Стаха» сведчаць кадры аб супольным абмеркаванні адснятага матэрыялу ў мантажнай студыі «Беларусьфільма» разам з Л. Міколай і В. Рубінчыкам [6. Арк. 1].

Фатаграфіі зафіксавалі цікавыя моманты працы У. С. Караткевіча над стужкай «Родная зямля». На адной з іх пісьменнік трымае ў руках адразу дзвюх яшчарак [7. Арк. 8]. Пра любоў і трапяткое стаўленне да роднай прыроды расказвае здымак, зроблены ў Друі. Фота добра пабудавана кампазіцыйна. Уладзімір Сямёнавіч корміць жарабя на фоне панарамы Друі: тут разам паядналіся і любоў пісьменніка да братоў нашых меншых, і яго цікавасць да помнікаў архітэктуры [7. Арк. 9].

Вялікая колькасць аматарскіх фота – пра любімыя віды адпачынку. У зборы БДАМЛМ ёсць шмат здымкаў: Караткевіч на прыродзе. Вядомы беларускі літаратуразнаўца М. Грынчык зняў Караткевіча на рыбалца на беразе ракі Шчары (1967). На адваротным баку фатаграфій заўвагі самаго пісьменніка:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«У пошуках залатой рыбкі», «Лавісь, рыбка, малая і найвялікшая!» [7. Арк. 1–3].

Здымкі з М. Грынчыкам на вакзале ў Стоўбцах. Некаторыя пісьменнік так пракаментаваў: «Застаўбіўся ў гісторыі ўжо!» і «Валачобнікі ў Стаўбцах» [8. Арк. 8]. У зборы ЦНБ НАНБ адкладзены фотаздымкі з вандровак Караткевіча па Прыпяці ў апошняе лета яго жыцця [34].

Некаторыя здымкі – сапраўдныя рэбусы. Адзін Уладзімір Сямёнавіч назваў «Вавёрка на дрэве пад вокнамі». І далей удакладніў: «Загадкавы малюнак: знайдзі вавёрку… А яна на скрыжаванні стрэлак» (пісьменнік пазначыў пошукі звярка стрэлачкамі). Без гэтых падказак знайсці вавёрку на маленькім фотаздымку проста немагчыма [7. Арк. 4; 8. Арк. 5].

Яшчэ адна фатаграфія. Без дапамогі дасвечаных асоб сказаць, з'яўляецца яна выпадкова зробленым удалым здымкам ці пастановачным, немагчыма. На гэтым фота У. Караткевіч разам з іншым мужчынам, стоячы па калена ў вадзе, нібыта спрабуе выпіхнуць застраглы ў лужыне аўтобус [7. Арк. 7]. Відавочна, ён быў жартаўніком і фантазёрам не толькі ў творчасці, але і ў штодзённым жыцці.

Пісьменнік любіў актыўны адпачынак не менш, чым рыбалку, і шмат вандраваў па краінах Усходняй Еўропы. У зборы ЦНБ НАНБ можна пазнаёміцца з вялікай калекцыяй аматарскіх здымкаў і паштовак з паездак па Польшчы (Кракаў, Вроцлаў, Варшава), Славакіі і Чэхіі, Балгарыі (Сафія, Варна, Плоўдзіў, Несебр) [33; 36].

Ён часта бавіў вольны час сярод сяброў. Фотакрыніцы збораў БДАМЛМ і ЦНБ НАНБ маюць шматлікія здымкі пісьменніка з калегамі-літаратарамі А. Адамовічам, Р. Барадуліным, Я. Коласам, К. Крапівой, П. Броўкам, І. Шамякіным, В. Быкавым, Я. Брылём, пісьменнікамі рэспублік СССР і замежных брацкіх краін [28; 29; 30; 8, арк. 6, 11; 9, арк. 1; 14, арк. 2, 15]. Адзін з групавых здымкаў распавядае пра наведванне У. Караткевічам разам з Я. Брылём, В. Віткам і С. Грахоўскім г. Магнітагорска ў 1960-я гг. [9, арк. 1].

Цесныя дачыненні, як сведчаць не толькі лісты, але і фотаздымкі, звязвалі пісьменніка з сябрамі Ю. К. Гальперыным і В. Ф. Краўцом, якому прысвечаны знакаміты «Аксамітны альбом» [12, арк. 2; 13, арк. 1, 2, 4].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобнае месца ў зборы ЦНБ НАНБ займаюць фотадакументы пра ўшанаванне памяці Уладзіміра Караткевіча. Гэта пераважна аматарскія здымкі, зробленыя сястрой пісьменніка Н. С. Кучкоўскай падчас адкрыцця помніка пісьменніку на Усходніх могілках у Мінску, мемарыяльнай дошкі ў Оршы, наведвання школьнага музея У. Караткевіча ў Аршанскай сярэдняй школе № 3, урачыстых вечарын з нагоды 60-годдзя У. Караткевіча (у Оршы і ў музеі гісторыі беларускай літаратры ў Мінску) [35].

Акрамя літаратурнай творчасці У. Караткевіч пакінуў нам больш за 600 малюнкаў. Паводле слоў Рыгора Барадуліна: «А мастак Караткевіч мог бы, відаць, спаборнічаць з пісьменнікам Караткевічам. Бездакорна валодаў лініяй, кампазіцыяй. Некалькімі штрыхамі мог перадаць характар, улюбёна-рамантычна ці здзекліва-гратэскава». Спецыялісты адзначаюць, што яны не друкаваліся пры жыцці пісьменніка з тае прычыны, што сам аўтар не лічыў іх самастойным відам сваёй творчай дзейнасці. Зараз значная частка графічнай спадчыны У. Караткевіча выйшла асобным, 18 томам Збору яго твораў [18].

Для замалёвак пісьменнік выкарыстоўваў любыя паперкі, на якіх можна зафіксаваць свае думкі і вобразы. Большая частка малюнкаў зроблена тушшу. Яны выкананы даволі прафесійна, з вялікім густам. У рукапісах малюнкі пісьменніка сустракаюцца даволі часта, яны спалучаюць паэзію і прозу, частка напісана ў сшытках з літаратурнымі творамі [22; 23; 26, арк. 177–181]. Такія замалёўкі, часцей партрэтныя, безумоўна, спрыялі натхненню і стварэнню літаратурных вобразаў. Нярэдка яго малюнкі яскрава дапаўняюць аўтарскую задумку твора, перадаюць настрой падчас напісання.

Сярод малюнкаў на асобных лістах паперы вылучаюцца глыбока філасофскія, трагічныя, а часам лірычныя. Раптоўна ў рукапісы Уладзіміра Сямёнавіча ўрываюцца вобразы гістарычных персанажаў, Хрыстос і біблейскія сюжэты, рыцары і князі, невядомыя замкі і планы крэпасцяў. Асобныя малюнкі маюць подпісы, тлумачальныя запісы, частка з іх пазначана крыптанімам «*УК*».

Пісаў У. С. Караткевіч і партрэты. Адны героі нам незнаёмыя, а іншых, напрыклад паэта Рыгора Барадуліна, пазнаць лёгка. Ёсць і тыпажы беларусаў, сялян і шляхцічаў. Сярод пер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

санажаў партрэтных замалёвак У. Караткевіча даследчыкі і чытачы бачаць сусветна вядомых дзеячаў культуры Л. В. Бетховена, А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля, а таксама сярэднявечных рыцараў-крыжакоў, К. Каліноўскага і яго паплечнікаў, украінскіх казакоў [25].

Мноства сюжэтаў і вобразаў у графічнай спадчыне У. Караткевіча ўражвае даследчыкаў. У карыкатурных малюнках – сюжэты тагачаснага штодзённага жыцця: «Лягушкультпросвет», «Шумеў камыш», «Скарга Сапежанкі», прагулкі матуль і бабуль з дзецьмі ў парку і інш. Часам, будучы ў лірычна-рамантычным настроі, пісьменнік прымушаў ажываць такія звычайныя рэчы, як піжама і халат [25, арк. 3, 38; 3, арк. 9, 13].

У малюнках на гістарычную тэму пісьменнік дакладна адлюстроўваў дэталі касцюма, зброі, планы мясцовасці і падзей, сілуэты дзейных асоб. Гэта дапамагала яму ствараць вобразны мастацкі тэкст і запамінальныя вобразы літаратурных герояў [21, арк. 54; 23, арк. 1; 25, арк. 9, 13, 27, 29, 44, 45, 48].

Акрамя малюнкаў самаго У. Караткевіча ў яго асабістым зборы можна знайсці накіды партрэтаў і сяброўскіх шаржаў на пісьменніка. Адзін з такіх шаржаў зроблены не менш знаным Васілём Быкавым [ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1189, 1196]. Сярод матэрыялаў збору даследчыкі могуць убачыць ілюстрацыю да казкі У. Караткевіча «Скрыпка дрыгвы і верасовых пустэчаў» [ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1231]. У асобную адзінку сабраны 21 дзіцячы малюнак, зроблены алоўкамі, акварэллю ці чарніламі [ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1234].

Асабістыя фонды ўяўляюць цікавасць для даследчыкаў яшчэ і таму, што сярод гэтых збораў можна знайсці крыніцы, якія не маюць непасрэднага дачынення да фондаўтваральніка. Захаваліся ў фондзе фотаздымкі малюнкаў вядомага беларускага мастака А. Марачкіна. Сярод выяўленчых матэрыялаў да ўвагі даследчыкаў – малюнак герба роду Загорскіх, выкананы Л. Баразной, а таксама рэпрадукцыя герба Віцебскай губерні [ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1225, 1233]. У зборы БДАМЛМ сабраны аматарскія фотаздымкі змеялова Недзялкава і яго дачкі, відавочна, зробленыя У. Караткевічам у Бярэзінскім запаведніку падчас здымак папулярнага фільма «Родная зямля» [11].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць Уладзіміра Караткевіча – гэта сапраўдная скарбніца беларускай культуры XX ст. Выўленчыя матэрыялы, сабраныя ў яго архіўным зборы, з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай для даследчыкаў і дазваляюць атрымаць шмат інфармацыі аб жыцці і творчасці слыннага сына Беларусі.


*1.* Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 56 (У. С. Караткевіч). – Воп. 1.

*2.* БДАМЛМ. – Ф. 56 (У. С. Караткевіч). – Воп. 2.

*3.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 23.

*4.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 31.

*5.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 32.

*6.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 33.

*7.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 34.

*8.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 38.

*9.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 40.

*10.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 42.

*11.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 43.

*12.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 2. – Спр. 30. – Арк. 1–2.

*13.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 31.

*14.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 2. – Спр. 32.

*15.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 2. – Спр. 33. – Арк. 1–2.

*16.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 2. – Спр. 35.

*17.* БДАМЛМ. – Ф. 56. – Воп. 2. – Спр. 36. – Арк. 1.

*18. Караткевіч, У. С.* Збор твораў : у 25 т. – Т. 18 : малюнкі. – Мінск : Маст. літ., 2019. – 510 с.

*19.* Рукапісны фонд Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР). – Ф. 11 (У. С. Караткевіч). – Воп. 1.

*20.* Рукапісны фонд ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11 (У. С. Караткевіч). – Воп. 2.

*21.* Рукапісны фонд ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР). – Ф. 11 (У. С. Караткевіч). – Воп. 2. – Адз. зах. 137.

*22.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 424.

*23.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 440.

*24.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 441.

*25.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 443.

*26.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 485.

*27.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1188. – Арк. 1, 3, 5, 7, 11.

*28.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1191.

*29.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1192.

*30.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1195.

*31.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1198.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*32.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1199.
*33.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1200.
*34.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1206.
*35.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1210–1215.
*36.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1216.
*37.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1217–1222.
*38.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1223.
*39.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1224.
*40.* ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. – Ф. 11. – Воп. 2. – Адз. зах. 1238.

# НОВАТОРСКИЕ ПРИЕМЫ ОРГАНИЗАЦИИ ПРОСТРАНСТВА ЗАПАДНОЕВРОПЕЙСКИХ ТЕАТРАЛЬНЫХ СООРУЖЕНИЙ

***М. С. Писарчик,*** *аспирант*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В годы правления королевы Елизаветы (1558–1603) в Англии появилось более десяти театров, схожих по конструктивному плану и художественно-декоративному оформлению (например, «Лебедь», «Театр Роз», «Надежда», «Фортуна», «Глобус») [1, с. 94]. Их объединяло то, что зрительные места представляли собой партер и несколько ярусов, а сцена была пространственной [2, с. 3]. Под термином «пространственная сцена» следует понимать один из видов арены, который относится к центровому типу театра, но в отличие от арены площадка пространственной сцены окружена местами для зрителей не со всех сторон, а только частично, с небольшим углом охвата [3].

«Елизаветинскому театру», «театру шекспировской эпохи» или «шекспировскому театру» посвящены сотни книг, буклетов, научных статей и конференций. В Лондоне (1997), Риме (2003) построены точные копии шекспировского «Глобуса».

Вместе с тем некоторые архитекторы, декораторы и художники при организации пространства театрального сооружения стали использовать новаторский прием стилизации, который не предполагает точного копирования, но являет собой сочетание конструктивных, художественно-декоративных и вырази-